Палата прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Адрас для адказу і інфармавання зацікаўленых:
Кавальковай Вольге Аляксандраўне
220123,  г.Мінск,і п/с  73

**Калектыўны зварот**

Мы, грамадзяне Рэспублікі Беларусь, просім прыняць і падтрымаць Закон «Аб выкарыстанні і ахове першага дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь», які надае юрыдычны статус бела-чырвона-беламу сцягу, які з'яўляецца першым дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь. Дадзены Закон рэгулюе прававыя асновы выкарыстання, папулярызацыі і аховы першага дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, які мае асаблівае гістарычнае і духоўна-маральнае значэнне для Рэспублікі Беларусь.

Стварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі і абвяшчэнне незалежнасці Беларусі ў 1918 годзе адбывалася пад бел-чырвона-белым сцягам.

19 верасня 1991 году Вярхоўным Саветам 12-га склікання быў прыняты Закон №1085-XII аб змене назвы Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі на Рэспубліку Беларусь. Законам Вярхоўнага Савета 12-га склікання ад 19 верасня 1991 года №1090-XII быў зацверджаны першы дзяржаўны сімвал Рэспублікі Беларусь – бела-чырвона-белы сцяг (далей па тэксце - бела-чырвона-белы сцяг). Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі ў 1991 годзе адбывалася пад бел-чырвона-белым сцягам. Бела-чырвона-белы сцяг з'яўляўся афіцыйным дзяржаўным сімвалам Рэспублікі Беларусь у перыяд з 19 верасня 1991 года па 6 чэрвеня 1995 года.

Адсутнасць юрыдычна замацаванага статусу бел-чырвона-белага сцяга, прыводзіць да спекуляцыі на гэтай тэме і росту супрацьстаяння ў грамадстве, паколькі змена дзяржаўнага сцяга пасля рэферэндуму, які адбыўся 14 траўня 1995 года, не была падтрымана часткай беларускага грамадства, якая да цяперашняга часу лічыць бел-чырвона-белы сцяг сапраўдным дзяржаўным сімвалам Беларусі і працягвае яго выкарыстоўваць падчас свайго ўдзелу ў масавых мерапрыемствах і дома.

Аднак згодна з дзеючым заканадаўствам бела-чырвона-белы сцяг з'яўляецца незарэгістраваным сімвалам, і на практыцы гэта азначае, што яго немагчыма выкарыстоўваць падчас масавых мерапрыемстваў. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь неаднаразова прыцягваліся і прыцягваюцца да адказнасці за выкарыстанне першага дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь падчас масавых мерапрыемстваў.

Прыняццё Закона «Аб выкарыстанні і ахове першага дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь» і наданне асаблівага юрыдычнага статусу бела-чырвона-беламу сцягу дазволіць зняць сацыяльную напружанасць у грамадстве і будзе спрыяць росту даверу да дзяржаўнай улады з боку беларусаў.

Дадатак: 1. Праект Закона. 2. Абгрунтаванне.

| № | Прозвішча, імя, імя па бацьку | Месца жыхарства | Кантактны тэлефон (e-mail) | Дата | Подпіс |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | | | | | |
| 2 | | | | | |

| № | Прозвішча, імя, імя па бацьку | Месца жыхарства | Кантактны тэлефон (e-mail) | Дата | Подпіс |
|---|---|---|---|---|---|
| 3 | | | | | |
| 4 | | | | | |
| 5 | | | | | |
| 6 | | | | | |
| 7 | | | | | |
| 8 | | | | | |
| 9 | | | | | |
| 10 | | | | | |
| 11 | | | | | |
| 12 | | | | | |
| 13 | | | | | |
| 14 | | | | | |
| 15 | | | | | |